(вербальны, невербальны, знакава-сімвальны), якая ў сваю чаргу і фарміруе, і даводзіць культурныя нормы і каштоўнасці [6, с. 80]. Для кожнага этнасу гэта будзе свая сацыяльная мова, якая фарміравалася на працягу гістарычнага развіцця, увабраўшы ў сябе і ўвесь выхаваўчы вопыт народа таксама. Менавіта таму выхаваўчы працэс у музеі па сродках сацыяльнай мовы – з'ява актуальная і неабходная на сённяшні дзень. Гэта актуальнасць пацвярджаецца яшчэ і тымі абставінамі, што фрагменты сацыяльных моў мінулых стагоддзяў – у народных рамёствах, паданнях і песнях, святах і, безумоўна, прадметах з побыту народа – існуюць і сёння. І менавіта музею па сіле зрабіць іх «дасціпнымі» для ўспрымання, «прачытання» наведвальнікамі.

Такім чынам, сучасны музей і ёсць адна з тых устаноў, якая здольныя наладзіць этнавыхаваўчы і адукацыйны працэс шляхам рэпрэзентацыі народнай, каранёвай культурнай традыцыі з мэтай наладжвання яе перадачы ад пакалення да пакалення сродкамі сацыяльнай мовы (а менавіта сацыяльных моў мінулых стагоддзяў). У агульным значэнні такога кшталту дзейнасць з'яўляецца інавацыйным спалучэннем этнапедагогікі і музейнай камунікацыі.

Спіс літаратуры:

1. Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь : Закон РБ // База дадзеных «Консультант плюс» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.consultant_plus.by. – Дата доступа : 19. 02. 2008.
2. Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы / уклад. В.В. Калацэй ; рэд. кал. В.В.Калацэй (адк. рэд.) [і інш]. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2007. – 72 с. : іл.
3. Калбаска, А. Заслаўскі музей-запаведнік як спроба рэалізацыі ідэй новай музеялогіі / А. Калбаска // Аператыўн. інфарм. па прабл. культуры і мастацтва : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 1995. – С. 49–68.
4. Музей і наведвальнік / рэдсавет: З. Шыбека (адказ. рэд.) [і інш]. – Мінск, 1999. – 43 с.
5. Кондратьев, В.В. Свойства музейного предмета и пути его использования / В.В. Кондратьев // Музееведение. Проблемы использования и сохранения музейных ценностей : сб. науч. тр. / НИИ культуры. – М., 1985. – С. 5–12.
6. Воронин, А.А. Музеи как креативное пространство культуры / А.А. Воронин // Философские исследования. – 1994. – № 1. – С. 69–84.

*Уладзімір Зяневіч*

## ПРАБЛЕМЫ ВЫКАРЫСТАННЯ БЕЛАРУСКАГА ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў НАВУЧАЛЬНЫМ ПРАЦЭСЕ

Сучаснае грамадства характарызуецца моцнымі і паскоранымі працэсамі глабалізацыі. У характары працякання апошніх выяўляюцца тэндэнцыя, з аднаго боку, да разбурэння натуральнага экакультурнага асяроддзя, страты, нівеліравання і, нават, знікнення адметных рысаў і асаблівасцей, уласцівых асобным этнасам, а з другога боку (як рэакцыя на першую), тэндэнцыя да пошукаў фундаментальных маральна-этычных аснаванняў культуры. На іх падставе падаецца магчымым адраджэнне і засваенне сапраўдных каштоўнасцей нацыянальнай матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны, станаўленне духоўных ідэалаў і ўмацаванне нацыянальна-культурнай самасвядомасці.

Традыцыйная мастацкая культура, фальклор Беларусі, як частка нацыянальнай духоўнай спадчыны, з'яўляюцца скарбонкай сацыяльнага досведу нашага народа, праяўленнем унікальнай мастацкай творчасці чалавека, прадыктаванай характэрнымі толькі для культуры народа Беларусі асаблівасцямі ладу яго жыцця. Яны могуць стаць падмуркам у разгортванні працы па экалогіі культуры як часткі сацыяльнай экалогіі сучаснага грамадства. Бо адной з сутнасных характарыстак традыцыйнай культуры з'яўляецца яе здольнасць рэгенерыраваць і інтэграваць у сістэме сучаснай культуры нацыянальна-адметнае ва ўмовах якога толькі і магчыма духоўнае здароўе нацыі. Фальклор ў гэтым аспекце ёсць сувязным элементам, гарантам гістарычнай пераемнасці як аднаго з найважнейшых іманентных законаў развіцця культуры.

Аднак дзяржаўнай аховы і грамадскай увагі патрабуе і сама вусная народная творчасць. У Рэспубліцы Беларусь на заканадаўчым узроўні выпрацавана сістэма «арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і іншых мер, накіраваных на недапушчэнне

знішчэння або пагрозы знішчэння» нацыянальнай духоўнай спадчыны*. Аднак, здольнасць яе да самаразвіцця ва ўмовах сучаснай рынкавай сістэмы прыводзіць да ўтылітарна-спажывецкага падыходу да спадчыны; адбываецца працэс трансферызацыі асноўных сутнасных рысаў з сферы мастацкай, і шырэй, духоўнай практыкі народу ў сферу культурнага спажывання насельніцтва.

У гэтых умовах узрастае роля кваліфікаваных кадраў у галіне культуралогіі, сацыяльнай экалогіі і этналогіі. Ва ўмовах глабалізацыі, якая, як мы адзначылі, мае як пазітыўныя, так і негатыўныя наступствы, супрацстаяць апошнім можна толькі абапіраючыся на прафесійна падрыхтаваныя кадры, якія добра валодаюць прадметам, бачаць праблему і могуць прапанаваць эфектыўныя метады яе вырашэння.

Праблема падрыхтоўкі прафесійных кадраў культуры непасрэдна звязана з праблемамі функцыянавання роднай мовы як формы выказвання, носьбіта духоўнай спадчыны, а праблемы выкарыстання беларускага песеннага фальклору ў навучальным працэсе адукацыйных устаноў Беларусі – гэта, па-сутнасці, праблемы інтэграцыі і функцыянавання традыцыйнай мастацкай культуры ў сістэме сучаснай культуры Беларусі.

Вырашэнне азначаных праблем ляжыць у плоскасці абрання адэкватнай ідэалогіі, на падставе якой можа адбывацца працэс аптымізацыі навучальнага працэсу, што, у сваю чаргу, забяспечыць надзейнае функцыянаванне навучальнай установы ў сучасных умовах.

Адным з крокаў на гэтым шляху з'яўляецца, на наш погляд, спалучэнне культуралагічнага, філасофскага і этналагічнага падыходаў да тлумачэння феномену песеннага фальклору Беларусі ў яго рэгіянальных і лакальных формах існавання. Такая пастаноўка праблемы абумоўлена шматузроўневым характарам самаго аб'екта вывучэння і даследавання і яна вымагае шчыльнага ўзаемадзеяння профільных кафедраў, адпаведнага тэматычнага планавання лекцый з улікам спецыфікі студэнцкай аўдыторыі. У сваю чаргу культуралагічны аналіз песеннага фальклору ў метадалагічным плане патрабуе аб'яднання этнаграфічнага, лінгвістычнага, філалагічнага, эстэтычнага і псіхалагічнага падыходаў.

Вельмі важная і складаная праблема навучальнага працэсу ляжыць у полі выяўлення і аргументацыі метадалагічных падстаў інтэрпрэтацыі песеннага фальклору ў сучаснай мастацкай практыцы.

Цэнтральнае месца ў вучэбна-педагагічным працэсе займае выпрацоўка эфектыўных методык і падрыхтоўка неабходнай вучэбнай і мэтадычнай літаратуры. Гэты напрамак педагагічнай дзейнасці ў дачыненні да праблем выкарыстання беларускага песеннага фальклору ў вучэбнай практыцы мае асаблівае значэнне, бо сам адукацыйны працэс праходзіць у педагагічным полі комплексу ўнікальных музычна-фальклорных дысцыплін, злучаючы ў адзіную вучэбна-педагагічную, навукова-даследчую і мастацка-творчую дзейнасць. Усё гэта складае пэўныя праблемы і накладвае адпаведныя абявязкі і значную адказнасць за падрыхтоўку і забеспячэнне навучальнага працэсу адпаведным вучэбна-метадычным матэрыялам. Патрабуюць далейшага асэнсавання і распрацоўкі ў дачыненні да беларускага песеннага фальклору метады сістэмнага, структурнага і функцыянальнага аналізу, што дасць студэнтам надзейны інструментарый, дазволіць лепш асэнсаваць месца, спецыфіку і функцыі народнай песні ў сучасным беларускім грамадстве.

Неацэннае значэнне ў навучальным працэсе на сучасным этапе набывае палявая фальклорная экспедыцыя па рэгіёнах Беларусі, непасрэдны ўдзел студэнта ў каляндарных і сямейных святах, у рэгіянальных конкурсах і фэстах, што дае магчымасць выкарыстаць метад уключанага назірання.

Эфектыўная форма прафесійнага станаўлення ва ўмовах навучання – студэнцкія навуковыя даследвані. Сацыяльна запатрабаванымі сёння з'яўляюцца веды ў галіне даследвання механізмаў функцыянавання традыцыйнай культуры ва ўмовах глабалізацыі, адаптыўнасць традыцыйных форм культуры, азначэнне механізмаў, якія спрыяюць функцыянаванню традыцыі, рэалізацыі яе сацыяльнай ролі, вывучэнне рэгіянальных і лакальных традыцыйных культур Беларусі, выяўленне асаблівасцяў беларускага музычнага фальклору і аналіз сучасных форм яго функцыянавання, вызначэнне спосабаў, форм і метадаў захавання і зберажэння нацыянальных каштоўнасцяў.

Кафедрам трэба смела выкарыстоўваць навукова-творчы патэнцыял студэнтаў у распрацоўцы планавых тэм у межах праграмы «Культура», у падрыхтоўцы і ўдзеле ў навукова-практычных канферэнцыях, стварэнні кафедральных навуковых альманахаў і выдавецтве на пастаяннай аснове зборнікаў студэцкіх навуковых работ, адпаведнай навуковай і тэхнічнай падрыхтоўцы і ўвядзенні ў навуковы і мастацка-творчы абарот эмпірычнага матэрыялу, назапашанага ў архівах адукацыйных і навуковых устаноў краіны (электронныя выданні зафіксаваных помнікаў традыцыйнай народнай культуры Беларусі).

---

* Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 98-З «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь». Глава 6. Артыкул 27. П. 1.